выкладчыкамі ў роднай навучальнай установе.

Сярод выпускнікоў універсітэта — удзельнікі Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы. Найбольш значных поспехаў дасягнулі заслужаны майстар спорту В.Яноўскі — чэмпіён Сеульскай алімпіяды па боксе; заслужаны майстар спорту па гімнастыцы А.Тумілові — чэмпіён свету ў камандных спаборніцтвах і бронзавы прызёр у асабістых; заслужаны майстар спорту па барацьбе І.Каныгін — чэмпіён свету, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў. Цяпер 24 студэнты з'яўляюцца членамі зборнай нацыянальнай каманды па розных відах спорту, пяцёра ўдзельнічалі ў апошняй Алімпіядзе.

З 1996 г. ва універсітэце працуе магістратура. Летась 18 чалавек атрымалі дыпломы магістраў педагогікі, магістраў філалогіі і магістраў матэматыкі. Сёлета плануецца абарона 38 магістэрскіх дысертацый.

Адукацыйныя традыцыі і назапашаны вопыт актыўна выкарыстоўваюцца для вырашэння асноўнай задачы — пераўтварэння ВНУ у класічны універсітэт. Побач з існуючымі адкрываюцца новыя спецыяльнасці. У сувязі з гэтым ствараюцца новыя кафедры — тэарэтычнай фізікі, псіхалогіі і карэкцыйнай работы, сацыяльнай работы, культуры і ўсеагульнай гісторыі і інш.

Намаганні ўсяго калектыву накіраваны на тое, каб зрабіць Віцебскі дзяржуніверсітэт вядучым адукацыйным, навуковым і культурным цэнтрам Паўночнай Беларусі.

---



## 120 гадоў з дня нараджэння акадэміка У.І.Пічэты

# Талент лектара і педагога

***Э.Р.Іофе**, доктар гістарычных навук, акадэмік Міжнароднай акадэміі вывучэння нацыянальных меншасцей, прафесар БДПУ імя М.Танка*

Уладзімір Іванавіч Пічэта — класік гістарычнай навукі, першы рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта, адзін з ініцыятараў стварэння Інстытута беларускай культуры, Акадэміі навук Беларусі, Інстытута славяназнаўства АН СССР, кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, акадэмік АН СССР і АН БССР, першы заслужаны прафесар БССР, аўтар больш за 515 друкаваных прац па гісторыі народаў СССР і замежных славянскіх народаў.

Аб яго жыцці, навуковай і грамадскай дзейнасці напісаны кнігі, зборнікі ўспамінаў, часопісныя і газетныя артыкулы. Значна менш даследавана, а дакладней, амаль зусім не даследавана дзейнасць У.І.Пічэты як лектара і педагога. На аснове выкарыстання архіўных даных, успамінаў родных і блізкіх, студэнтаў і аспірантаў Уладзіміра Іванавіча мы паспрабавалі запоўніць гэты прабел.

У.І.Пічэта нарадзіўся 9 (21) кастрычніка 1878 г. у Палтаве. Яго бацька, Іван Хрыстафоравіч, серб па нацыянальнасці, атрымаў духоўную адукацыю і прысвяціў сябе выкладчыцкай дзейнасці. Нягледзячы на духоўны сан, Іван Хрыстафоравіч прытрымліваўся прагрэсіўных поглядаў. Ён быў добра знаёмы з сербскім рэвалюцыйным дэмакратам С.Марковічам і вядомым рускім пісьменнікам У.Г.Караленкам. "Ён зрабіў на сына глыбокі маральны ўплыў. Усё жыццё Уладзімір Іванавіч захоўваў аб ім удзячную памяць і глыбока паважаў яго як разумнага і надзвычай праніклівага чалавека" [1, *75*].

У 1897 г. У.І.Пічэта скончыў Палтаўскую класічную гімназію і паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта. Ён слухаў лекцыі М.М.Багаслоўскага, М.В.Доўнар-Запольскага, П.Г.Вінаградава, В.І.Гер'е, М.С.Карэліна,В.О.Ключэўскага і іншых вядомых вучоных-гісторыкаў. Найбольш моцны ўплыў на студэнта Уладзіміра Пічэту аказаў Ключэўскі — навуковы кіраўнік яго кандыдацкай працы "Юрый Крыжановіч аб Маскоўскай дзяржаве", якая атрымала высокую адзнаку. У чэрвені 1901 г. У.І.Пічэта скончыў Маскоўскі універсітэт з дыпломам першай ступені (з залатым медалём), потым працаваў у сярэдніх навучальных установах Масквы, выкладаў рускую мову і граматыку, а таксама методыку першапачатковага выкладання ў Каростышаўскай настаўніцкай семінарыі Кіеўскай губерні, рускую мову і літаратуру ў камерцыйным вучылішчы, мужчынскай класічнай гімназіі, гандлёвай школе, жаночай гімназіі ў Екацярынаславе. Усюды ён карыстаўся вялікай павагай і папулярнасцю сярод моладзі.

У верасні 1905 г. У.І.Пічэта пераехаў у Маскву, дзе выкладаў спачатку ў сярэдніх навучальных установах, а потым — у вышэйшых. Акрамя таго, часта выступаў з лекцыямі перад рабочымі. Пазней Уладзімір Іванавіч пісаў, што лекцыі для рабочых друкарні І.Д.Сыціна з'явіліся для яго першай спробай лектарскай дзейнасці ў рабочай аўдыторыі [2,*145*].

У 1909 г. У.Пічэта здаў магістэрскі экзамен, а з мая 1910 г., пасля прачытання дзвюх спробных лекцый у прысутнасці камісіі факультэта, быў зацверджаны ў званні прыват-дацэнта Маскоўскага універсітэта. Аднак яго выкладчыцкая дзейнасць тут працягвалася нядоўга. З прызначэннем на пост міністра народнай асветы Расіі рэакцыянера Л.А.Касо універсітэт у знак пратэсту пакінула група перадавых прафесараў і прыват-дацэнтаў. Сярод іх быў і У.І.Пічэта.

З 1906 па 1917 г. Уладзімір Іванавіч прымаў актыўны ўдзел у рабоце курсаў, арганізаваных земствамі для настаўнікаў народных школ, дзе выкладаў рускую гісторыю. Ён чытаў лекцыі ў Сімферопалі, Самары, Вятлузе, Пензе, Варонежы, Бранску, Дзмітраве Курскай губерні. У 1908 г. лекцыі вучонага ў Самарскім народным універсітэце былі забаронены з-за іх дэмакратычнай накіраванасці.

Кастрычніцкая рэвалюцыя застала У.І.Пічэту выкладчыкам на Вышэйшых жаночых курсах і ў Практычнай Акадэміі камерцыйных навук. Стаўшы прафесарам Маскоўскага універсітэта, Уладзімір Іванавіч працягваў працаваць настаўнікам гісторыі ў 158-ай адзінай працоўнай школе г. Масквы. Як успамінае яго дачка Ксенія Уладзіміраўна, бацька вельмі любіў маладое пакаленне і лічыў, што кожны будучы вучоны павінен прайсці праз выкладанне ў сярэдняй школе. Цікава, што У.І.Пічэта быў праціўнікам экзаменаў у школе і прапаноўваў выводзіць адзнаку за год па выніках вучобы на працягу года. У той жа час ён быў вельмі патрабавальным настаўнікам.

З кастрычніка 1920 г. жыццё і дзейнасць У.І.Пічэты непарыўна звязаны з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, рэктарам якога ён быў прызначаны 8 ліпеня 1921 г. 1 чэрвеня 1921 г. адкрываецца рабочы факультэт БДУ, а потым — медыцынскі і факультэт грамадскіх навук, які складаўся з чатырох аддзяленняў: грамадска-педагагічнага, этнолага-лінгвістычнага, эканамічнага і прававога.

Уладзімір Іванавіч разумеў, што вядучым факультэтам ва універсітэце павінен быць педагагічны. У 1922 г. па яго ініцыятыве ў БДУ была праведзена рэарганізацыя, у складзе факультэта грамадскіх навук засталіся два аддзяленні — эканамічнае і прававое, а грамадска-педагагічнае і этнолага-лінгвістычнае ўвайшлі ў склад педагагічнага факультэта з аддзяленнямі: сацыяльна-гістарычнае, этнолага-лінгвістычнае, фізіка-матэматычнае і прыродазнаўчае. У першы год на педфаку навучалася 730 студэнтаў.

Рэктарам БДУ У.І.Пічэта быў да 10 кастрычніка 1929 г. Акрамя таго, з 1921 па 1930 г. ён прафесар на кафедры гісторыі народнай гаспадаркі, дзе чытае курсы гісторыі БССР, гісторыі народнай гаспадаркі Расіі і Беларусі, гісторыі рускага і беларускага права, гісторыі аграрных адносін у Беларусі, гісторыі рускай культу-

ры, а таксама вядзе семінарскія заняткі па гэтых дысцыплінах [3, *14—15, 11, 23*].

На ўсё жыццё запомніліся лекцыі і семінары У.І.Пічэты былым студэнтам БДУ, многія з якіх сталі гордасцю беларускай навукі і культуры — вучонымі, пісьменнікамі і паэтамі, грамадскімі дзеячамі. Вось што пісаў вядомы вучоны-гісторык, доктар гістарычных навук М.М.Улашчык: "У.І.Пічэта выдзяляўся не толькі як афіцыйная асоба (рэктар), але і як буйнейшы знаўца гісторыі і культуры Беларусі... Уладзімір Іванавіч вёў два семінары... Пасля таго як мы навучыліся ясна фармуляваць змест параграфа, Уладзімір Іванавіч запатрабаваў, каб мы запісвалі яго змест на паперы, таксама "у двух словах"... Уладзімір Іванавіч улічваў нашу недастатковую падрыхтоўку і даваў магчымасць агледзецца, асвоіцца з матэрыялам, і праз які час мы сталі спраўляцца з тымі задачамі, якія ён перад намі ставіў" [4, *68—69*].

Высокая ацэнка У.І.Пічэты як педагога ўтрымліваецца і ў інтэрв'ю, дадзеным аўтару гэтага артыкула адной з першых выпускніц БДУ М.Я.Адзярыхай: "Гэта быў адзін з лепшых лектараў універсітэта. Асабліва выдатна ён чытаў лекцыі па гісторыі рускага права. Калі звінеў званок, ніхто не хацеў паднімацца. У.І.Пічэта ўмеў накіроўваць работу студэнтаў над сабой. Ён не скупіўся на пахвалу за настойлівую працу... Я не памятаю,каб хто-небудзь з студэнтаў спазніўся на лекцыі або пайшоў... У.І.Пічэта змог прывіць нам любоў да працы, навукі, і гэта вызначыла жыццёвы шлях многіх з нас".

Прафесар Пічэта выступаў за адкрыццё ў БДУ сваёй аспірантуры, якая рыхтавала б навуковыя і выкладчыцкія кадры не толькі для універсітэта, але і для іншых ВНУ рэспублікі. Яго намаганні не прапалі дарэмна. У 1927 г. Саўнаркам БССР прыняў пастанову аб адкрыцці ў Беларускім дзяржаўным універсітэце аспірантуры па грамадскіх навуках [5]. У лістападзе 1928 г. У.І.Пічэта пісаў: "БДУ заняты цяпер падрыхтоўкай беларускай моладзі да навуковай дзейнасці, падрыхтоўкай той змены, якая павінна заняць месца больш старых. Мы верым у навуковыя здольнасці нашай моладзі,.. верым у яе творчыя імкненні і жаданні аддаць свае сілы свайму народу, сваёй Айчыне" [6].

Для сваіх вучняў У.І.Пічэта быў не толькі навуковым кіраўніком, але і сябрам. Ён выхоўваў у іх любоў да навукі, высокія маральныя якасці, патрабавальнасць да сябе і іншых. Уладзімір Іванавіч валодаў дзіўнай здольнасцю своечасова падтрымаць свайго выхаванца, накіраваць яго работу па правільным шляху, тактоўна ўказаць на памылкі, зрабіць самы строгі разбор нездавальняючай яго працы так, што ў таго, каго настаўнік крытыкаваў, не толькі не апускаліся рукі, а, наадварот, хацелася працаваць больш і лепш. У.І.Пічэта ўмеў ствараць на сваіх занятках абстаноўку сапраўды творчых дыскусій і спрэчак. Ён паважаў і любіў сваіх вучняў, клапаціўся пра іх. І яны любілі і паважалі свайго настаўніка [4, *120—121*].

Будучы акадэмік М.Н.Ціхаміраў пісаў у чэрвені 1947 г. у насценгазеце гістарычнага факультэта БДУ, што У.І.Пічэта спалучаў у сабе талент вялікага даследчыка і педагога. Яго лекцыі, выступленні заўсёды былі цікавыя і жывыя, слухаліся з неаслабнай увагай [4, *129*]. Доктар гістарычных навук, прафесар В.У.Карасёў адзначаў такую прыкметную рысу характару У.І.Пічэты, як моцнае і вострае пачуццё новага. Мала сказаць, што Уладзімір Іванавіч быў наватарам, ён быў абуджальнікам. Сваімі яскравымі лекцыямі ён абуджаў усё лепшае, што ёсць у чалавеку [4, *130*].

Для ўсіх, хто яго ведаў, У.І.Пічэта назаўсёды застаўся ўзорам передавога, сапраўднага вучонага — эрудыта, нястомнага даследчыка, таленавітага педагога, гарачага патрыёта і інтэрнацыяналіста. Ён вёў навуковыя дыскусіі, як правіла, на парытэтных пачатках, разглядаючы субяседніка як паўнапраўнага партнёра, вельмі сур'ёзна ставіўся да меркаванняў маладых вучоных, аспірантаў. Будучы вельмі патрабавальным, Уладзімір Іванавіч адначасова ўважліва прыслухоўваўся да думак тых, хто толькі пачынаў свой шлях у навуцы, даваў поўную самастойнасць у рабоце, шчодра надзяляў сваім даверам і больш хваліў, чым крытыкаваў [4, *98*].

Сярод маладых гісторыкаў Масквы сярэдзіны 40-ых гг. было шмат гаворкі пра "пічэтнікі". Так называлі аспіранцкі семінар, які Уладзімір Іванавіч праводзіў рэгулярна, раз у тыдзень, у сваёй кватэры. Тут заслухоўваліся даклады, главы дысертацый, ішла зацікаўленая размова аб надзённых навуковых праблемах. Гэта была цудоўная школа абмену навуковымі думкамі. З яе выйшлі буйныя савецкія гісторыкі В.Д.Каралюк, І.М.Бяляўская, І.С.Мілер, Г.Э.Санчук, польскія вучоныя Ц.Бабіньска, Ж.Карманава і інш.

Уладзімір Іванавіч кіраваў гэтым своеасаблівым калектывам з велізарнай тактоўнасцю, чуйна прыслухоўваўся да

выказванняў удзельнікаў семінара, цярпліва, з максімальнай увагай ставіўся да кожнага даследчыка. "Пічэтнікі" карысталіся вялікай папулярнасцю ў Інстытуце гісторыі АН СССР [7, *82—83*].

У.І.Пічэта быў не толькі вялікім вучоным, але і вельмі пяшчотным бацькам. У гэтым таксама праявіліся яго педагагічны талент і тактоўнасць. Калі яго дачка Ксенія заканчвала школу, Уладзімір Іванавіч напісаў ёй у альбом сваё настаўленне, якое адлюстравала яго жыццёвае крэда (пісьмо раней не друкавалася): "...Я хачу, каб ты была маладой, каб радасць яркім сонечным святлом азарала тваю пяшчотную душу; я хачу, каб ты была дужай і вытрымала націск дзевятага валу жыццёвага шляху. Я хачу, каб ты смяялася, каб гора і смутак не азмрочвалі твой жыццёвы шлях. Няхай будзе ён светлым... Радасць твая будзе маёй радасцю, твая журба асветліць журбою і маю душу... Ніколі не мірыся з пошласцю і мяшчанствам. Адыходзь ад зайздрасных і ідзі насустрач тым, хто вітае цябе. Паважай сябе і любі сяброў: без іх цяжка жыць, і ты ніколі не будзеш адзінокай. Будзь смелай і настойлівай у дасягненні шчасця і цвёрдай у журбе. Праганяй чорны смутак: ён старыць і сушыць сэрца, гавары заўсёды: "няхай будзе радасць у жыцці", гучна крычы: "хай жыве жыццё!" ...Ніколі не схіляй сваёй галоўкі да зямлі і не паднімай яе да неба. Глядзі перад сабой прама і пільна, і ты знойдзеш правільны шлях у жыцці... Уставай рана на зары. Няхай сонца сваім прывітаннем разбудзіць цябе. ...Ты маладая, твая будучыня наперадзе. Ты ўбачыш іншае жыццё. Ты яшчэ пазмагаешся!"

У шэрагу сваіх прац У.І.Пічэта ўздымае актуальныя праблемы гісторыі і тэорыі педагогікі. Так, у артыкуле "Дзве культуры на Беларусі (буржуазная культура і культура сацыялістычная)" ён пісаў: "Калі буржуазныя гуманісты XVI ст. ужо не былі прыхільнікамі шырокай асветы народных мас і глядзелі на школы з свайго класавага пункту гледжання як на сродак для падрыхтоўкі культурных дзеячаў для абароны сваіх класавых інтарэсаў, чужых народнай масе, калі стары царскі ўрад, адкрываючы школы, імкнуўся праз школы русіфікаваць беларускую народную масу, то Савецкая ўлада прыступала да будаўніцтва нацыянальнай школы як магутнай зброі асветы працоўных мас... Поўная рэарганізацыя школы, метадаў навучання, саміх задач у пастаноўцы адукацыі з'яўляецца найвялікшым культурным пераваротам..." [8, *143—144*].

Уладзімір Іванавіч быў гарачым прыхільнікам ідэі ўсеагульнага навучання. "...І блізкі дзень, — пісаў ён, — калі неадукаваныя стануць адукаванымі, калі прымітыўныя культурныя навыкі заменяцца іншымі навыкамі, калі зменіцца духоўнае аблічча ўсяго народа, калі традыцыйнае рэлігійна-філасофскае светаразуменне застанецца адным успамінам, паказчыкам былога прыгнёту і былой прыніжанасці" [8, *145*].

Неабходнасці стварэння вышэйшай школы ў Беларусі быў прысвечаны артыкул У.І.Пічэты "Савецкая ўлада і пытанне аб адкрыцці універсітэта ў Беларусі". У ім падкрэслена: "...Будучая вышэйшая навучальная ўстанова павінна адкрыць свае дзверы для тых працоўных, якія ў эпоху царскага рэжыму не маглі паступіць ва універсітэт, бо дарога ў апошні была для іх закрыта" [9, *137*].

У.І.Пічэта з'яўляецца стваральнікам школы савецкага славяназнаўства, характэрнымі рысамі якой з'яўляюцца шырыня праблематыкі даследаванняў, паварот да вывучэння новай і найноўшай гісторыі славянскіх краін. З 1939 г. ён узначальваў кафедру гісторыі паўднёвых і заходніх славян МДУ імя М.В.Ламаносава і кіраваў сектарам славяназнаўства Інстытута гісторыі АН СССР, а 1 студзеня 1947 г. быў прызначаны намеснікам дырэктара Інстытута славяназнаўства АН СССР.

23 чэрвеня 1947 г. назаўсёды спынілася сэрца выдатнага вучонага і педагога У.І.Пічэты.

1. *Королюк В.Д.* Владимир Иванович Пичета (Опыт творческого портрета) // Вопросы истории. — 1970.— № 8.
2. *Пичета В.И.* Энтузиасты // Пречистенские рабочие курсы. — М.: Московский рабочий, 1948.
3. Белорусский Государственный Университет за 1921—1922 академ. год. — Минск, 1922; Белорусский Государственный Университет в 1922—1923 уч. году.— Минск, 1923.; Белорусский государственный университет им.В.И.Ленина. — Минск: Государственное издательство Белоруссии, 1971.
4. Славяне в эпоху феодализма. — М.: Наука, 1978. — 343 с.
5. Собрание законов и распоряжений Рабоче-Крестьянского правительства БССР. — 1927.— № 29.
6. Савецкая Беларусь. — 1928. — 7 лістапада.
7. Вопросы истории. — 1970. — № 8.
8. Советское строительство. — 1928. — № 3—4.
9. Советское строительство. — 1928. — № 6.